УДК 378

Л. М. Дзіцэвіч, начальнік аддзела выхаваўчай работы з моладдзю БДТУ

# ВЫКАРЫСТАННЕ СРОДКАЎ І ПРЫЁМАЎ АРАТАРСКАГА МАЙСТЭРСТВА Ў ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОЦЕ

The article informs about the oratory means and techniques in the educational work as well as about different communicative effects: visual image, first phrases, reasoning, quantum burst of information, intonation and pauses, artistic expressiveness, relaxation, dispersion. It also gives some information about verbal and non-verbal means of communication: words, gestures, facial expression, postures, distance, visual contact, skin reactions. The article is recommended to be used by the curators of students' groups as well as by the educators on the campus.

**Уводзіны.** Выхаваўчая работа ўяўляе сабой складаны працэс, часткай якога з'яўляецца камунікатыўная дзейнасць – шматканальная сістэма ўзаемадзеяння людзей. Асноўнымі яе працэсамі лічаць камунікатыўны, які забяспечвае абмен інфармацыяй; інтэрактыўны, які рэгулюе ўзаемадзеянне партнёраў у кантактах; перцэптыўны, які арганізуе ўзаемаўспрыняцце, узаемаацэнку і рэфлексію ў кантактах [1]. Камунікатыўныя навыкі забяспечваюць эфектыўнасць кантактаў і псіхалагічную сумяшчальнасць пры арганізацыі сумеснай работы [2]. Асоба таго, хто выхоўвае, з'яўляецца публічнай і выкарыстоўвае вербальныя і невербальныя сродкі зносінаў. Вербальная камунікацыя – гэта кантакты з дапамогай слоў, невербальная – перадача інфармацыі з дапамогай няслоўных сродкаў: погляду, мімікі, жэстаў, позы, рухаў, прасторы [3].

**Асноўная частка.** Красамоўства з'яўляецца важнай прыметай прафесійнага выкарыстання вербальных сродкаў. Красамоўства, па сутнасці, – гэта ўменне прыгожа гаварыць і пераконваць, што вельмі неабходна ў выхаваўчай дзейнасці.

Для захавання эфектыўных кантактаў неабходна памятаць пра асноўныя прынцыпы маўленчага ўздзеяння: даступнасць, асацыятыўнасць, сенсорнасць, экспрэсіўнасць, інтэнсіўнасць.

Захоўваючы даступнасць вербальнага ўздзеяння на студэнтаў, неабходна вывучыць іх культурна-адукацыйны ўзровень, выхаванне ў сям'і, індывідуальныя асаблівасці. Асацыятыўнасць азначае выклікание суперажывання, вобразнасці слухачоў. Выхавальнік выкарыстоўвае аналогіі, ссылкі. Вялікае ўздзеянне маюць паэзія, музыка, жывапіс, відэа.

Сенсорнасць абумоўлена задзейнічаннем чалавечых адчуванняў, без якіх не абыходзіцца выхаваўчы працэс, бо менавіта тады інфармацыя пранікае ў псіхіку найбольш эфектыўна і найбольш актыўна ідзе яе засваенне.

Экспрэсіўнасць прадугледжвае эмацыйную напружанасць маўлення. Працэс пераканання грунтуецца на прынцыпах станоўчага эмацыйнага фону, звязанага з выкарыстаннем пазітыўных эмоцый: спакою, добразычлівасці, упэўненасці, павагі, задавальнення, любві. Слова пад уздзеяннем такіх эмоцый набывае незвычайную сілу, бо сведчыць пра поўную самааддачу педагога.

Інтэнсіўнасць абазначае тэмп падачы інфармацыі. Для выбару аптымальнага тэмпу неабходна ўлічваць індывідуальныя, псіхалагічныя і ўзроставыя асаблівасці студэнтаў, настрой, зацікаўленасць у прадмеце гутаркі.

Усе гэтыя прынцыпы красамоўства выступаюць у выглядзе самых розных камунікатыўных эфектаў: візуальнага іміджу, першых фраз, аргументацыі, квантавага выкіду інфармацыі, інтанацыі і паўзы, мастацкай выразнасці, рэлаксацыі і дысперсіі.

Надзвычай важным для педагога з'яўляецца знешні выгляд. Вопратка, прычоска, абутак знаходзяцца ў зоне ўвагі студэнтаў і аказваюць на іх уздзеянне яшчэ да пачатку маўлення. Асноўнай асаблівасцю знешняга выгляду асобы, якая займаецца выхаваўчай работай ва ўстановах адукацыі, з'яўляецца акуратнасць, а сярод стылю пераважае афіцыйны. Вядома, з усёй разнастайнай вопраткі кожны выбірае тую, якая найбольш адпавядае ягонаму стылю, а таксама абставінам маўлення.

Эфект першых фразаў звычайна ўзмацняе першаснае ўяўленне пра таго, хто выхоўвае, або зніжае. Таму неабходна спачатку вызначыць мэту маўлення.

Яшчэ адным спосабам эфектыўнага пачатку маўлення з'яўляецца пастаноўка пытанняў, асабліва рытарычных. Напрыклад, каб пераканаць студэнтаў у выбары здаровага ладу жыцця, можна рытарычна спытаць: «Як і з чым нам змагацца? З абставінамі, якія перашкаджаюць нам мяняць да лепшага наша жыццё, з людзьмі, якія прапагандуюць старыя ўяўленні, ці з уласнай інертнасцю мыслення?» [4]. Падчас выхаваўчага маўлення можна выкарыстоўваць рознага роду гісторыі, факты, падзеі, якія вельмі любіць наша студэнцтва і якія вельмі добра запамінаюцца. Так, напрыклад, з мэтай патрыятычнага выхавання можна расказаць сітуацыю з адраджэннем чэшскай мовы ў Чэхіі ў перыяд анямечвання ў XVIII ст., калі таварыства «Яднота» гуртавала народ і натхняла на вяртанне нацыянальных традыцый. У выхаваўчай дзейнасці, звязанай з маўленнем, можна выкарыстаць і любы факт, звязаны з датай маўлення, напрыклад, кожная другая субота з'яўляецца Днём здароўя, і ў гэты дзень прыдатнымі будуць гутаркі пра здаровы лад

жыцця. Можна выкарыстоўваць у выхавальніцкіх мэтах Дні прафілактыкі СНІДу, беларускай навукі, чарнобыльскай трагедыі, Святога Валянціна, Таццянін дзень, Дзень хіміка, моладзі, работнікаў лесу, настаўніка і інш., а таксама дні святаў народнага календара: Дзяды, Каляды, Гуканне вясны, Вялікдзень і інш.

Эфект квантавага выкіду інфармацыі неабходны для захавання ўвагі ў аўдыторыі. Куратар ці выхавальнік размяшчае новую інфармацыю праз пэўныя прамежкі маўлення. Неабходна памятаць, каб гэтая інфармацыя была актуальнай, цікавай, прыцягальнай. Яе можна набыць на сайтах структур, што займаюцца выхаваўчай дзейнасцю.

Эфект мастацкай выразнасці неабходны для павышэння сілы пераканаўчасці маўлення. Пры пераводзе думак у адпаведныя словы трэба захоўваць мелодыку выказвання, выкарыстоўваць павышэнне і паніжэнне голасу, што надае выказванню асаблівую пераканаўчасць. Вялікую сілу ўздзеяння на маладых людзей аказваюць лагічныя націскі ў маўленні. Адна і тая ж фраза, вымаўленая з выкарыстаннем вялікага і самага вялікага лагічнага націску і без іх, аказвае розны па пераканальнай моцы ўплыў. Таксама вельмі прадуктыўным па выніку маўлення з'яўляецца такі рытарычны інструмент, як паўза. Лічыцца, што паўзы садзейнічаюць 10–15%-наму далучэнню інфармацыі. Такая асаблівасць чалавечага ўспрыняцця. Калі педагог упэўнены, што яго слухачы ўключыліся ў выхаваўчы працэс, што іх мысленне, эмацыянальнасць і вобразнасць знаходзяцца ў актыўнай пазіцыі, тады паўзы неабходныя для асэнсавання інфармацыі, далучэння да яе ўласных меркаванняў з вопыту перажытага ці атрыманага праз самыя розныя каналы і асэнсаванага раней. Не менш важным па ўздзеянні на слухачоў лічыцца тэмп маўлення – колькасць гукаў, складоў і слоў у адзінку часу. Звычайны тэмп маўлення – 120 слоў за хвіліну, аднак пры паведамленні важнай інфармацыі, насычанай назвамі, фактамі, лічбамі, тэмп запавольваецца, а сіла голасу зніжаецца, інфармацыя ж, насычаная эмоцыямі, падаецца больш хуткім тэмпам пры выкарыстанні большай сілы голасу. Кожнаму педагогу трэба памятаць пра важнасць рэлаксацыі ў выхаваўчай дзейнасці. Падчас успрымання маўлення педагога студэнты не бываюць уважлівымі ў поўнай ступені на працягу доўгага адрэзку часу, ім патрабуецца адпачынак для аднаўлення ўвагі, асабліва пры ўспрыманні складанай інфармацыі. Мэта эфекту рэлаксацыі – зняць псіхалагічнае напружанне. Класічным прыкладам гэтага з'яўляецца гумар, дзякуючы якому ствараецца натуральная паўза для адпачынку і набываецца магчымасць для аднаўлення эмацыйнай энергіі, а таксама слуханне музыкі, візуальнае ўспрыняцце нагляднасці, гульнёвыя элементы і інш.

Эфект дысперсіі нагадвае педагогу пра рассейванне інфармацыі па меры яе атрымання. Калі мы на пачатку маўлення маем 100% інфармацыі, то на перавод думак у словы губляецца 10%, на вуснае агучванне расходуецца яшчэ 10%, на магчымасць пачуць – 10%, на магчымасць зразумець – 10%, на запамінанне – 35%. Такім чынам, па закону дысперсіі ў памяці слухачоў застаецца 25% інфармацыі. Невербальныя зносіны – гэта кантакты праз няслоўныя знакавыя сістэмы, сярод якіх на першае месца па важнасці вылучаюць візуальную.

Візуальная сістэма ўключае ў сябе жэсты, міміку, позы, скуравыя рэакцыі, прастору, кантакт вачыма. Такой сістэме ўдзяляецца мала ўвагі ў выхаваўчым працэсе, аднак гэта не здымае яе важнасці. Маўленне, пазбаўленае жэстаў, паказвае на скаванасць, няўпэўненасць, што не спрыяе пераканаўчасці. Пры жэстыкуляцыі неабходна памятаць пра наступныя правілы:

- найлепш успрымаюцца натуральныя, плаўныя жэсты;
- жэстыкуляцыя не павінна быць беспераппыннай;
- жэсты і словы ўтвараюць адно цэлае;
- для выразнасці і пераканаўчасці выкарыстоўваць разнастайныя жэсты.

Асаблівая роля ў выхаваўчым маўленні адводзіцца міміцы – рухам мышцаў твару, сярод якіх асноўнымі з'яўляюцца мышцы броваў, рота і вачэй, якія перадаюць спектр самых разнастайных эмоцый: радасці, здзіўлення, гневу, страху, варожасці і інш. Японскі пісьменнік Коба Абэ лічыў твар натуральным сродкам камунікацыі і назваў яго «сцяжынкай паміж людзьмі», а пісьменнікі, мастакі і філосафы бачаць у твары сродак спасціжэння чалавечай душы, своеасаблівы «пашпарт» чалавека [5]. Для стварэння станоўчага псіхалагічнага клімату, рэалізацыі пазітыўных кантактаў педагогу неабходна ўмець прыводзіць свой твар і эмацыйную зону ў пазітыўнае сугучча.

Важнае месца ў кантактах займае поза – становішча чалавечага цела, якое наглядна паказвае яго псіхалагічна-эмацыйны стан. Калі педагог мяркуе стварыць атмасферу адкрытасці, даверлівасці, згоды, добразычлівасці, то яму найбольш падыйдуць адкрытыя далоні, распраўленыя плечы, расшпілены пінжак, прыўзнятая галава, уцягнуты жывот і ўсмешка на твары.

Не кожны педагог, асабліва маладога ўзросту, мае вопыт публічнасці, уменне прамаўляць перад вялікай аўдыторыяй, таму яго няўпэўненасць, скаванасць могуць перадаваць скуравыя рэакцыі: пачырваненне, з'яўленне чырвоных плямаў ў вобласці твару, шыі, бледнасць твару, патлівасць твару і рук і інш. Маўленне становіцца непераканаўчым і не прыцягвае да сябе ўвагу студэнтаў. Для пераадолення праяваў непублічнасці існуе шэраг практыкаванняў і трэнінгаў.

Псіхічны і этычны камфорт ў выхаваўчых кантактах у многім вызначаецца дыстанцыяй паміж сумоўцамі, таму педагогу неабходна ведаць, што існуюць наступныя прасторавыя зоны зносінаў:

- інтымная зона (да 50 см), у яе дапускаюцца толькі блізкія людзі, якія стварылі атмасферу даверлівасці і таму могуць ужываць і тактыльныя кантакты, дапускаць датыканні. Некаторыя педагогі могуць дазваляць сабе такія зносіны, аднак яны вымагаюць вялікай падрыхтоўкі, інакш такія кантакты могуць разглядацца студэнтамі як парушэнне на іх свабоду і недатыкальнасць;
- асабістая, ці персанальная, зона (50–120 см) выкарыстоўваецца ў кантактах з сябрамі і калегамі;
- сацыяльная зона (120–400 см) звычайна ўтвараецца ў службовых кабінетах, гэта самая прыдатная зона для кантактаў са студэнтамі ў аўдыторыі;
- публічная зона (звыш за 400 см) для кантактаў з вялікай групай людзей, напрыклад, пры чытанні лекцый.

Візуальны кантакт вачыма з'яўляецца вельмі важным для выхаваўчых кантактаў. Каб усталяваць пазітыўныя зносіны са студэнтамі, неабходна глядзець на іх ад 60 да 70% на працягу ўсёй размовы. Трэба ўлічваць таксама якасць погляду і зону кантакту. Лепш за ўсё накіроўваць погляд на раён ілба, што спрыяе дзелавому стылю. Погляд жа паверх акуляраў можа расцэньвацца студэнтамі як крытычны, пасля якога ў іх ёсць магчымасць закрыцца ад кантактаў: перакрыжаваць рукі і ногі і апусціць галаву. Лепш за ўсё здымаць акуляры пры маўленні і надзяваць іх пры слуханні. Касы погляд часта ўспрымаецца як варожы, сведчыць пра падазронасць, а «пусты» ці «цяжкі» погляд гаворыць пра негатыўныя эмоцыі і не спрыяе ўсталяванню пазітыўных кантактаў.

**Заключэнне.** Асноўным вынікам кантактаў педагога са студэнтамі цераз вербальныя і невербальныя сістэмы з'яўляецца разуменне не толькі якасцяў маладых людзей, але і матываў і прычын іх дзеянняў, а таксама садзейнічанне фармаванню ў іх уменняў распачынаць і захоўваць зносіны паміж людзьмі.

## Літаратура

1. Рагожынская, Т. А. Станаўленне і развіццё камунікатыўных навыкаў падлеткаў / Т. А. Рагожынская // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 2. – С. 65–70.

2. Тамсама.

3. Кузняцоў, І. М. Рыторыка / І. М. Кузняцоў. – Мінск: Тэтра сістэмс, 2003. – 559 с.

4. Печенева, Т. Особенности убеждающей речи / Т. Печенева // Беларуская думка. – 2009. – № 2. – С. 112–117.

5. Рачкоўская, А. У. Што ж напісана на твары? / А. У. Рачкоўская // Роднае слова. – 2009. – № 2. – С. 57–59.